## НАШЕ НАСЛЕДИЕ

**С. Я. Новікаў**

# КАМСАМОЛЬСКАЯ МОЛАДЗЬ ІНСТЫТУТА Ў КАНТЭКСЦЕ ГІСТОРЫІ МІНСКАГА ІНЯЗА

В статье автор продолжает исследование истории МГПИИЯ на этот раз на примере деятельности одной из общественных организаций молодежи и ее руководящего органа – комитета комсомола Минского иняза. Становление, развитие и функционирование этого структурного подразделения шло в русле основных тенденций, характерных для развития лингвистического ВУЗа советского периода, окончание которого в истории советской страны привело к логической ликвидации структуры молодежной организации в институте. Благодаря целеустремленности институтского руководства, творческому поиску лично секретарей комсомольской организации и их помощников на факультетском уровне коллектив студенческой молодежи с неиссякаемой энергией участвовал в самых различных начинаниях, что успешно продолжают их нынешние наследники молодежной организации БРСМ в МГЛУ.

Урачыстасці, прысвечаныя 70-годдзю Мінскага іняза і праведзеныя ў МДЛУ восенню 2018 г., фактычна супалі па часе са стогадовым юбілеем Ленінскага камсамола, які на дзяржаўным узроўні адзначалі ў нашай краіне [1]. Не засталася непрыкметнай гэта падзея і для маладзёжнай арганізацыі ўніверсітэта, дзе з удзелам прадстаўнікоў кіраўніцтва гарадской і раённай адміністрацыі, рэктарата і ветэранаў камсамольскага руху адбылося святочнае мерапрыемства, прысвечанае «100-летию ВЛКСМ» [2]. Падчас гэтых знакавых падзей гучала шмат слоў пра неабходнасць захавання сувязі пакаленняў, памнажэння традыцый і працягу эстафеты актыўнага ўдзелу цяперашняга студэнцтва ў справах адукацыі і выхавання.

Даследаванне гісторыі Мінскага іняза вылучае на першае месца даволі актуальную задачу па напісанні хоць бы кароткага нарыса гэтай маладзёжнай грамадскай арганізацыі, праз школу якой у савецкі час прайшлі тысячы камсамольцаў інстытута. Такая задача аўтару гэтых радкоў бачыцца надзвычай надзённай, паколькі сёння гісторыя камсамола інстытута не знайшла яшчэ свайго ўсебаковага адлюстравання [3; 4; 5; 6; 7]. У той жа час адной са слаўных старонак гісторыі Мінскага іняза з’яўляецца актыўны ўдзел менавіта студэнцкай моладзі ў жыцці інстытута, горада і краіны, яе здаровае імкненне рабіць добрыя справы, вылучацца ініцыятывай.

З дакументальных крыніц вынікае, што праз паўтара месяца пасля адкрыцця Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў адбылося першае пасяджэнне камітэта камсамола. На ім па прапанове сакратара партыйнай арганізацыі А. А. Лізурчыка і дырэктара інстытута М. Ф. Жаўрыда быў абраны першы сакратар маладзёжнай арганізацыі, а таксама сфарміраваны камітэт, у які ўвайшлі 7 чалавек на чале з сакратаром – Чага Людмілай Аляксандраўнай [8, арк. 5]. Гэта колькасць складала толькі

палову ад той, якой яна стала роўна праз 20 гадоў. У пачатку снежня 1968 г. у склад камітэта камсамола інстытута на чале з А. Кірпічовай былі ўключыны 15 чалавек: гэта 2 намеснікі сакратара па арганізацыйнай (В. Чэркас) і ідэалагічнай працы (А. Бурак), астатнія ж адказвалі за працу культмасавага, бытавога, працоўнага, акадэмічнага, ідэалагічнага сектараў, сектара спорту і турызму, а таксама сектара ўліку [9, арк. 22]. Колькасны склад камсамольскай арганізацыі павялічыўся з 350 камсамольцаў у 1948/49 да 3 857 у 1972/73 навучальным годзе, з якіх выкананнем пастаянных грамадскіх даручэнняў былі занятыя 3 117 студэнтаў. Камсамольскі актыў складалі 1 010 студэнтаў інстытута [10, арк. 9; 11, арк. 25]. У 1976/77 навучальным годзе агульная колькасць студэнтаў, якія навучаліся на стацыянары, складала 3 663 чалавекі, сярод якіх усе былі камсамольцамі [12, арк. 1]. У пачатку 1981/82 навучальнага года ў структуру камсамольскай арганізацыі інстытута ўваходзілі 5 факультэцкіх і 2 выкладчыцкія першасныя камсамольскія арганізацыі, у тым ліку 1 097 студэнтаў на факультэце англійскай мовы, 496 – на факультэце французскай мовы, 449 – на факультэце нямецкай мовы, 267 – на факультэце іспанскай мовы і 307 камсамольцаў – на перакладчыцкім факультэце, а таксама 98 камсамольцаў з падрыхтоўчага аддзялення і першаснай камсамольскай арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў [13, арк. 21].

Першы план работы камсамольскай арганізацыі быў зацверджаны ў канцы кастрычніка 1948 г. і замацоўваў асноўныя мерапрыемствы, якія павінны былі правесці ў інстытуце студэнты на працягу лістапада. Цікава даведацца, чым жа жыла тагачасная камсамольская моладзь, што стаяла ў цэнтры яе ўвагі ў першыя месяцы існавання самастойнай лінгвістычнай ВНУ, на што быў скіраваны маладзёжны запал. Першым мерапрыемствам, праведзеным напярэдадні 7 лістапада 1948 г., стаў вечар, прысвечаны 31-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі. Да гэтай жа даты планаваўся выпуск факультэцкіх насценных газет, у тым ліку інстытуцкай газеты «Лінгвіст». Наступнае мерапрыемства, запланаванае на 11 лістапада, – стварэнне лектарскай групы інстытута ў складзе 15 чалавек. Літаральна праз дзень камсамольцы разглядалі пытанні аб арганізацыі прадметных і моўных гурткоў для студэнтаў, у тым ліку для больш паглыбленага вывучэння беларускай, англійскай, французскай і нямецкай моў. Наступная важная справа, якую планавалася правесці 13 лістапада, звязана з вылучэннем і зацвярджэннем на пасяджэнні камітэта камсамола 11 піянерважатых для работы ў падшэфнай школе № 6 горада Мінска. У сярэдзіне месяца планавалася правядзенне агульнаінстытуцкага закрытага камсамольскага сходу з разглядам пытанняў аб Пастанове XVII пленума УЛКСМ, давыбарах камітэта і зацвярджэнні кандыдатаў на абласную камсамольскую канферэнцыю. Апроч таго, планам прадугледжвалася правядзенне семінараў для групоргаў па пытаннях абмену іх першым вопытам работы, колькаснага росту шэрагаў камсамольцаў у інстытуце, а таксама абмеркаванне пытанняў ў раздзеле «Рознае». Цягам трэцяй дэкады планавалася склікаць студэнтаў для заслухоўвання даклада на тэму «Аб міжнародным становішчы». На канец

месяца быў запланаваны культпаход у кінатэатр для прагляду фільма «Повесть о настоящем человеке» з яго наступным абмеркаваннем на сходах у групах. Пасяджэнне камітэта маладзёжнай арганізацыі інстытута планавалася праводзіць штотыднёва па аўторках [14, арк. 17].

Такім чынам, з моманту ўтварэння Мінскага іняза распачалася гісторыя маладзёжнай камсамольскай арганізацыі, якая праіснавала да канца савецкай эпохі. На сёння аўтарам гэтых радкоў выяўлены шматлікія дакументальныя матэрыялы, якія дазваляюць узнавіць ход асноўных падзей [15].

Цягам чатырох дзесяцігоддзяў на чале камсамольскай арганізацыі Мінскага іняза стаялі сакратары. На жаль, у дакументах камітэта камсамола першых гадоў яго дзейнасці намі не выяўлены імёны ўсіх кіраўнікоў, таму давялося іх аднаўляць па ўскосных матэрыялах партыйнай арганізацыі МДПІЗМ 1950-х – першай паловы 1960-х гадоў. Выяўленыя прозвішчы мы згадваем у храналагічнай парадку: Л. Чага, (?) Буковіч, В. Кунін, Л. Старыкава, З. Пятрухіна, М. Абразцова, Н. Ганчарова, М. Зайцава, М. Лешчанка, (?) Карачоў, Ж. Пушкарчук, В. Жукаў, М. Сталяроў, М. Бондар, В. Васілевіч, М. Абразцова, А. Мешчаракоў, З. Калантай, Г. Рудак, С. Рачкоў, В. Новікаў [16; 17; 18; 19; 20; 21; 22; 23; 24; 25; 26; 27; 28; 29; 30; 31; 32; 33; 34; 35; 36; 37]. Нельга забываць, што яны стаялі на чале камітэта камсамола, у склад якога ўваходзілі іх намеснікі, прадстаўнікі камсамольскіх бюро факультэтаў і студэнцкіх груп, хто на справе адказваў за правядзенне арганізацыйнай, ідэалагічнай выхаваўчай работы са студэнтамі. Гэтыя людзі ўзначальвалі інстытуцкую камсамольскую арганізацыю і яе структурныя падраздзяленні, а таксама на справе з'яўляліся сапраўднымі лідарамі камсамольскай моладзі, актывістамі, выдатнікамі. Яны вялі за сабой іншых, арганізоўвалі і праводзілі самыя розныя мерапрыемствы, выязджалі ў студэнцкія будаўнічыя атрады, працавалі на новабудоўлях вялікай савецкай краіны, у дзіцячых аздараўленчых лагерах, на аб'ектах сельскай гаспадаркі, абслугоўвання і вытворчасці. У дакументальных крыніцах мы знаходзім шмат імёнаў, безліч добрых спраў, мерапрыемстваў, дасягненняў і г.д. Але толькі на некаторых з іх мы можам спыніцца ў кароткім нарысе аб дзейнасці камсамольскай моладзі Мінскага іняза. У той жа час варта заўважыць, што паколькі вялікі атрад інстытуцкай моладзі пакінуў столькі спраў у гісторыі інстытута, то пажадана б пра іх напісаць цэлую кнігу, уключыць у летапіс гісторыі канкрэтныя імёны інязаўцаў.

Вось толькі некаторыя старонкі з кароткага нарыса пра інстытуцкі камсамол. Удзел у дзейнасці камсамольскай арганізацыі азначаў далучэнне да грамадскага жыцця студэнта на ўзроўні вучэбнай групы, курса, факультэта і інстытута. На ўсіх згаданых узроўнях моладзь рэгулярна ўдзельнічала ў правядзенні камсамольскіх сходаў, праз якія магла ўплываць на вырашэнне самых розных пытанняў студэнцкага жыцця як цягам акадэмічных заняткаў, так і па-за імі, у тым ліку ў студэнцкіх інтэрнатах, школах, піянерскіх лагерах, падчас праходжання вучэбнай практыкі і г.д. Такая форма ўдзелу

ў грамадскім жыцці дазваляла студэнтам праявіць свае лепшыя якасці, адчуць пачуццё адказнасці, навучыцца ўзаемадзейнічаць з рознымі людзьмі дзеля вырашэння важных задач.

Не заставалася камсамольская моладзь у баку ад вырашэння бягучых і стратэгічных пытанняў акадэмічнага характару, удзелу ў ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце, у навуковай дзейнасці, падрыхтоўцы творчых работ для розных конкурсаў, у тым ліку рэспубліканскіх і ўсесаюзных. Так, у 1969 г. камсамольскі актывіст, студэнт факультэта іспанскай мовы М. Лыцін, на III Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, атрымаў першую прэмію і залаты медаль за навуковую работу па палітычнай эканоміі [3, с. 29]. Камсамольская моладзь прымала актыўны ўдзел у навукова-даследчай працы. У 1972/73 навучальным годзе 2 100 студэнтаў шчыравалі на гэтай ніве; у 74 гуртках пры кафедрах займаліся 1 673 студэнты, на рэспубліканскі конкурс прадставілі 137 работ [11, арк. 24].

У сярэдзіне 1980-х гадоў практычна ўсе студэнты інстытута былі ахоплены навукова-практычнай дзейнасцю, пры гэтым 795 былі занятыя ў распрацоўцы дзяржбюджэтных і гаспадарча-дагаварных тэм. Па выніках рэспубліканскага конкурсу 1986 г. 6 студэнтаў інстытута былі ўзнагароджаны дыпломамі Міністэрства вышэйшай адукацыі і грашовымі прэміямі, 32 студэнцкія работы адзначаны дыпломамі і 36 работ накіраваны на Усесаюзны конкурс студэнцкіх навуковых прац [38, арк. 44].

У плане работы партыйнай арганізацыі з камсамольскай моладдзю адзначаны мерапрыемствы, скіраваныя на героіка-патрыятычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне, фарміраванне навуковага светапогляду студэнтаў, выхаванне камуністычных адносін да працы і прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, фарміравання камуністычнай маралі, эстэтычнай і фізічнай культуры, набыцця ведаў і атрымання практычных навыкаў ў вобласці вядзення грамадска-палітычнай працы. Выхаваўчая работа ў інстытуце вызначалася шматлікасцю форм. Для студэнтаў дзейнічалі клубы інтэрнацыянальнай дружбы, універсітэт культуры і прававых ведаў, клуб выхаднога дня, праводзіліся цыклы лекцый, вечарыны, бяседы за круглым сталом, вусныя журналы і завочныя вандроўкі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, заслужанымі настаўнікамі, выпускнікамі інстытута, арганізоўваліся экскурсіі за межы рэспублікі, турыстычныя паходы, эстафеты, дні паэзіі [3, с. 30].

Асаблівую актыўнасць праяўлялі камсамольцы інстытута ў прафесійнай падрыхтоўцы да сваёй будучай дзейнасці ў якасці настаўніка. Па ініцыятыве моладзі быў створаны клуб «Сэрца аддаю дзецям». Удзельнікі клуба працавалі атраднымі важатымі ў школах, педагагічных атрадах пры домакіраўніцтвах і пры пакоях міліцыі. Клуб рэгулярна арганізоўваў канферэнцыі па педагагічнай праблематыцы, дыспуты, абмеркаванні кінафільмаў, сустрэчы з настаўнікамі, экскурсіі ў лепшыя школы рэспублікі [Там жа, с. 31–32]. Асобна трэба прыгадаць аб шэфскай дапамозе, якую аказвалі студэнцкія педагагічныя атрады ў горадзе і на сяле. Напрыклад, толькі

у 1978 г. чатыры педагагічныя атрады (92 чалавекі) актыўна працавалі ў Гарадзішчанскай, Заслаўскай, Ждановіцкай, Ратамскай школах, студэнты-інязаўцы перадалі ў школьныя бібліятэкі сотні кніг на замежных мовах. З улікам тых студэнтаў, хто вёў шэфскую работу ў школах горада, у першую чаргу ў Партызанскім раёне, агульная колькасць студэнцкіх педагагічных атрадаў складала 602 чалавекі. Многія студэнты з'яўляліся важатымі піянерскіх і камсамольскіх гурткоў, праводзілі са школьнікамі бяседы, вікта-рыны, арганізоўвалі ранішнікі, дыспуты, зборы, палітінфармацыі, выступалі з канцэртамі, выпускалі насценныя газеты, прымалі ўдзел ў рабоце клубах інтэрнацыянальнага сяброўства, афармлялі альбомы, дапамагалі праводзіць тэматычныя камсамольскія сходы і інш. [39, арк. 209].

Адным з важных напрамкаў дзейнасці камсамольскай моладзі інстытута ў савецкі час стала грамадска-патрыятычнае выхаванне студэнтаў. Як адзна-чалася ў справаздачы камітэта камсамола аб ваенна-патрыятычным выха-ванні моладзі, напярэдадні 30-х угодкаў святкавання Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, кожны камсамолец, кожны студэнт быў ахоплены той ці іншай формай гэтай работы, якая праводзілася як у маштабе інстытута, так і на ўзроўні студэнцкіх груп. Галоўным каардынатарам такой работы стаў героіка-патрыятычны студэнцкі клуб «Радзіма» пад кіраўніцтвам дэкана факультэта іспанскай мовы Я. А. Маслыкі. Камсамольская моладзь факуль-тэта разам з дэканам выступіла з ідэяй стварэння мемарыяльнага знака ў вёсцы Гатава Мінскага раёна дзеля ўшанавання памяці 350 імёнаў воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў летам 1944 г. Каб зарабіць на гэта сродкі, студэнтамі інстытута было праведзена 47 суботнікаў і нядзельнікаў. Разам з моладдзю інстытута ў пошукавай справе і падрыхтоўцы мемарыяльнага знака ўдзельнічалі камса-мольцы завода Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Мінску, «Вторчермета» і наву-чэнцы Навадворскай сярэдняй школы. Перад афіцыйным адкрыццём мемарыяльнага знака было праведзена перазахаванне рэштак загінуўшых. Урачыстае мерапрыемства адбылося 8 мая 1975 г. напярэдадні 30-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Побач з 12-метровай стэлай быў высаджаны парк з 3 000 дрэваў. Гэта месца і сёння з'яўляецца знакавым. Стала добрай традыцыяй кожны год у дзень Перамогі ладзіць сустрэчу студэнтаў інстытута, рабочых завода Кастрычніцкай рэвалюцыі і навучэнцаў Навадворскай СШ [12, арк. 3–4].

Самай маштабнай справай, у якой актыўна ўдзельнічалі прадстаўнікі камсамольскай моладзі інстытута, можна з упэўненасцю назваць студэнцкі будаўнічы рух ці ўдзел моладзі ў трэцім працоўным семестры. У 1958 г. са студэнтаў трох факультэтаў інстытута быў сфарміраваны першы цалінны атрад [40, с. 12], эстафету якога моладзь інстытута працягвала тры наступныя дзесяцігоддзі. Калі ў 1970 г. у трэцім семестры ўдзельнічалі 9 будаўнічых атрадаў, дык праз 3 гады іх колькасць павялічылася да 12 (481 студэнт інстытута), а яшчэ праз 2 гады ў трэцім працоўным семестры ўзялі ўдзел

больш за паўтысячы камсамольцаў іняза. Гэта быў рэкордны год у асваенні капіталаўкладанняў – студэнты інстытута рапартавалі аб асваенні 1 млн 28 тысяч рублеў, байцы студэнцкіх атрадаў далі 120 канцэртаў, прачыталі 68 лекцый, тым самым умацоўвалі эканамічную моц савецкай краіны, працай выхоўваючы маладое пакаленне [41, с. 24]. Не менш важным было і тое, што без удзелу студэнцкай моладзі не абыходзілася ўзвядзенне новых вучэбных карпусоў інстытута і інтэрнатаў, добраўпарадкаванне жылых дамоў у новых мікраараёнах Мінска. Апрача вытворчай дзейнасці студэнты бясплатна аказвалі дапамогу школам і дзіцячым садкам, займаліся добраўпарадкаваннем помнікаў на воінскіх пахаваннях, выконвалі шэфства над ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і людзьмі сталага ўзросту. Як вынікае з архіўных дакументаў, сярэдзіна і другая палова 1970-х гадоў – гэта час, калі ў інстытуце штогод фарміравалася 15 студэнцкіх будаўнічых атрадаў, якія працавалі на тэрыторыі вялікай савецкай краіны – у Якуціі, Уральскай вобласці, Комі АССР, Карэліі, Казахстане, Малдавіі, Крыме, а таксама на шматлікіх аб'ектах народнай гаспадаркі БССР. Так, сярод 15 атрадаў, сфарміраваных у 1978 г., 8 працавалі за межамі Беларусі (Карэлія, Пскоўская вобласць, Малдаўская ССР), 7 – у БССР. У пераліку назваў атрадаў, сфарміраваных у тыя гады ў Мінскім інязе, былі наступныя: «Алеся», «Альтаір», «Аўрора», «Будаўнік», «Іскра», «Лінгвіст», «Мерыдыян», «Прамень», «Радзімічы», «Рубікон», «Славуціч», «Спадчына», «Ударнік», «Факел», «Юбілейны» [42, арк. 172]. У сярэдзіне 1980-х гадоў колькасць атрадаў зменшылася да 9, колькасць удзельнікаў студэнцкіх будаўнічых атрадаў вагалася ў раёне 270 студэнтаў, месцамі дыслакацыі 7 атрадаў сталі аб'екты народнай гаспадаркі Мінскай і Віцебскай абласцей БССР, толькі два атрады працавалі ў Карэльскай і Малдаўскай ССР [43, арк. 23].

Асобным радком у гісторыі дзейнасці камсамольскай моладзі інстытута неабходна напісаць пра ўдзел студэнтаў у дапамозе калгасам і саўгасам рэспублікі падчас правядзення восеньскіх сельскагаспадарчых работ. У гэтым выпадку колькасць удзельнікаў, у параўнанні з будаўнічымі атрадамі, узрастала амаль удвая. Напрыклад, восенню 1982 г. 1 115 студэнтаў былі накіраваны на сельгасработы, з якіх 460 студэнтаў 1 курса, 298 – 2, 20 – 3, 301 – 4 і 36 студэнтаў выпускнога 5 курса, 705 з іх былі дзяўчатыстудэнткі [44, арк. 19].

На рубяжы 1970–80 гадоў асаблівыя намаганні камсамольская моладзь інстытута пачала скіроўваць на інтэрнацыянальную работу са студэнтамі розных краін і кантынентаў, якая стала ў парадак дня камітэта камсамола пасля адкрыцця ў 1979 г. падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян. Дзеля больш актыўнага выхавання духу сяброўства ў замежнай моладзі, пралетарскага інтэрнацыяналізму, актывізацыі супрацоўніцтва з прадстаўнікамі іншых краін свету быў створаны Клуб інтэрнацыянальнага сяброўства інстытута. Пад яго кіраўніцтвам праводзілі мэтанакіраваную работу гурткі інтэрнацыянальнага сяброўства на факультэтах англійскай, французскай,

нямецкай і іспанскай моў: рэгулярна адбываліся бяседы пра У. І. Леніна, тэматычныя сустрэчы з замежнымі студэнтамі, у тым ліку чыталіся лекцыі па гісторыі БССР, камсамола, Савецкай арміі, савецкай касманаўтыкі, наладжваліся экскурсіі па памятных мясцінах Беларусі, Мінска і яго ваколіцах, рэгулярна наведваліся музеі, тэатры, выставы. У лістападзе 1981 г. на базе інстытута быў праведзены міжнародны студэнцкі тыдзень, у красавіку 1982 г. – тыдзень інтэрнацыянальнай салідарнасці моладзі, у час якіх адбыліся конкурсы палітычнай песні і палітычнага плаката, мітынгі салідарнасці ў падтрымку студэнцкай моладзі іншых краін свету [45, арк. 7–8].

Шмат увагі надавалі беларускія студэнты куратарству над замежнымі студэнтамі, якія вывучалі рускую мову для таго, каб у далейшым працягнуць навучанне ў іншых вышэйшых навучальных установах Беларусі і СССР. Такую працу яны праводзілі не толькі ў час сумеснага пражывання з замежнымі студэнтамі ў інтэрнаце інстытута, але і ў шматлікіх зямляцтвах замежных студэнтаў. Так, у 1982 г. на падрыхтоўчым факультэце навучаліся 110 студэнтаў з 27 краін свету, якія былі аб’яднаны ў 10 зямляцтваў, у тым ліку Сацыялістычнай Рэспублікі В’етнам, Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан, Мадагаскар, Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Емен, Кіпра, Палесціны, Іарданіі, Марока, Гвінеі-Бісаў, Сан-Томе і Прынсіпі [46, арк. 9].

На заканчэнне кароткага гістарычнага нарыса пра камсамол Мінскага іняза хацелася б звярнуцца да аднаго з актыўных удзельнікаў гэтага руху – Л. Гулюты, якая ў гады свайго навучання ў МДПІЗМ з 1974 па 1979 гг. была членам камсамольскага бюро факультэта англійскай мовы, сакратаром камсамольскай арганізацыі курса, уваходзіла ў склад камітэта камсамола інстытута, пасля заканчэння якога працавала намеснікам загадчыка аддзела ЦК ЛКСМБ, з’яўлялася камісарам Рэспубліканскага штаба будаўнічых атрадаў. Будучы сярод удзельнікаў урачыстага сходу, прысвечанага 100-годдзю ВЛКСМ, які адбыўся ў Палацы Рэспублікі 29 кастрычніка 2018 г., яна выказала слушную думку, што «не выпадкова і не дарэмна наш час выбраў менавіта нас весці за сабой камсамольскую моладзь» [47][1]. Можна цалкам пагадзіцца з такой думкай адной з лепшых выпускніц СШ № 1 імя В. Ф. Купрэвіча г. Смалявіч Мінскай вобласці і ад сябе дадаць, што час заўжды выбірае выключна лепшых, актыўных, апантаных, ініцыятыўных, неабыякавых прадстаўнікоў моладзі.

Такім чынам, дзякуючы мэтанакіраванасці кіраўніцтва камітэта камсамола інстытута, творчаму пошуку студэнцкай моладзі першасных факультэцкіх камсамольскіх арганізацый і іх шматлікаму актыву на ўзроўні студэнцкіх груп калектыў студэнтаў Мінскага іняза з невычэрпнай энергіяй удзельнічаў у самых розных пачынаннях, захоўваючы слаўныя маладзёжныя традыцыі таго часу, якія актыўна працягвае цяперашняе студэнцтва МДЛУ.

---

[1] Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць Ларысе Аркадзьеўне Трыгубавай – дырэктару ІПКіПК МДЛУ за інфармацыйную падтрымку ў час падрыхтоўкі артыкула.

ЛІТАРАТУРА

1. История ВЛКСМ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://edu.gov.by/sistema-obrazovaniya/glavnoe-upravlenie-vospitatelnoy-raboty-i-molodezhnoy-politiki/upr-molodezhi/100-letie-vlksm/istoriya-vlksm/. – Дата доступу : 04.03.2019.

2. 100-летие ВЛКСМ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://www.mslu.by/news/100-letie-vlksm. – Дата доступу : 04.03.2019.

3. Минский государственный педагогический институт иностранных языков. Краткий исторический очерк. – Минск : Выш. шк., 1974. – 134 с.

4. *Краснова, Н. Г.* Страницы моей жизни / Н. Г. Краснова. – Минск : Изд. Центр БГУ, 2012. – 132 с.

5. *Новікаў, С. Я.* Ля вытокаў стварэння МДЛУ / С. Я. Новікаў // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. – 2012. – № 11. – С. 219–223.

6. *Новікаў, С. Я.* «Малая зала» Мінскага іняза / С. Я. Новікаў // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. – 2013. – № 12. – С. 230–240.

7. *Новікаў, С. Я.* Кузня лінгвістычных кадраў вышэйшай кваліфікацыі / С. Я. Новікаў // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. – 2014. – № 13. – С. 219–227.

8. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 1 : Протокол № 1 заседания комитета комсомола МГПИИЯ от 13.10.1948 г.

9. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 23 : Протокол № 1 заседания бюро комитета комсомола МГПИИЯ от 10.12.1968 г.

10. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 4 : Протокол № 2 счетной комиссии по выборам комитета комсомола института от 7.10.1951 г.

11. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 69 : Постановление XX отчетно-выборной комсомольской конференции МГППИЯ от 25.10.1973 г.

12. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 99 : Отчет комсомольской организации МГПИИЯ по военно-патриотическому и физическому воспитанию молодежи в 1975–1976 гг.

13. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 172 : Сводная структура комсомольской организации МГПИИЯ на 1981/82 учебный год.

14. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 1 : План работы комсомольской организации МГПИИЯ на период с 1 по 30 ноября 1948 года.

15. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3: Опись № 3 дел организации ЛКСМБ Минского государственного педагогического института иностранных языков за 1948–1986 гг.

16. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 14 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1952 г.

17. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 16 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1954 г.

18. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 18 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1956 г.

19. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 20 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1958 г.

20. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 22 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1960 г.
21. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 24 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1962 г.
22. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 26 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1964 г.
23. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 2. Спр. 28 : Протоколы № 1–12 заседания бюро партийной организации МГПИИЯ за 1966 г.
24. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 82 : Асабістая справа Калантай Зоі Леанідаўны.
25. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 101 : Асабістая справа Старыкавай Людмілы Яўгеньеўны.
26. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 344 : Асабістая справа Зайцавай Марыі Мікалаеўны.
27. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 4913 : Асабістая справа Сталярова Міхаіла Венедзіктавіча.
28. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 6590 : Асабістая справа Васілевіч Вячаслава Міхайлавіча.
29. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 8232 : Асабістая справа Мешчаракова Анатоля Васільевіча.
30. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 11149 : Асабістая справа Рудак Галіны Іванаўны.
31. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 12080 : Асабістая справа Рачкова Сяргея Анатольевіча.
32. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 2. Спр. 14656 : Асабістая справа Новікава Віктара Барысавіча.
33. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 117 : Асабістая справа Лешчанка Міхаіла Іванавіча.
34. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 183 : Асабістая справа Ганчаровай Наталлі Аляксандраўны.
35. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 1302 : Асабістая справа Жукава Валерыя Панцялеевіча.
36. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 4419 : Асабістая справа Пятрухінай Зоі Дзмітрыеўны.
37. Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 4521 : Асабістая справа Кірпічовай Алы Георгіеўны.
38. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 211 : Постановление XXVII отчетно-выборной комсомольской конференции МГППИЯ от 23.10.1986 г.
39. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 114 : О работе педагогических отрядов института в подшефных школах и домоуправлениях.
40. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 122 : Отчет комсомольской организации МГПИИЯ на XXIII отчетно-выборочной конференции 29.10.1969 г.
41. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 93 : Рапорт комсомольской организации МГПИИЯ XXV съезду КПСС от 13 февраля 1976 г.

42. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 114 : Отчет штаба трудовых дел комитета комсомола МГПИИЯ об итогах 3 трудового семестра 1978 года.
43. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 208 : Места дислокации студенческих строительных отрядов МГПИИЯ в 1985 году.
44. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 172 : Отчет высшего заведения о работе студентов в период летних каникул и осенних сельхозработ в 1982 году.
45. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 172 : Отчет о работе клуба интернациональной дружбы МГППИЯ в 1981/82 учебном году.
46. НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 3. Спр. 172 : О работе комсомольской организации МГППИЯ с иностранными студентами в 1981/82 учебном году.
47. *Тригубова, Л. А.* Время выбрало нас [Электронны рэсурс] / Л. А. Тригубова // Материалы специального выпуска газеты «Alma Mater». – Рэжым доступу : https://vk.com/alma.mslu/. – Дата доступу : 29.10.2018.

*Поступила в редакцию 20.05.2019*